УДК 821.161.3.09 “19” – 1

# ЖАНРАВАЯ РАЗНАСТАЙНАСЦЬ ПАЭЗІІ ЗОСЬКІ ВЕРАС

**М.А. Фешчанка**
*ДУА “Навадворская сярэдняя школа Мінскага раёна”*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь, mracapra4@gmail.com*

У артыкуле разглядаецца жанравая разнастайнасць паэзіі Зоські Верас: патрыятычная, інтымная і пейзажная лірыка. Асаблівая ўвага надаецца вобразнай сістэме вершаў паэтэсы, а таксама аналізуецца, як асабісты жыццёвы вопыт і грамадская дзейнасць уплывалі на яе творчасць, ацэньваецца значнасць вершаў Зоські Верас для беларускай літаратуры пачатку ХХ стагоддзя.

*Ключавыя словы:* Зоська Верас, беларуская паэзія, лірыка, вобраз роднай песні, вобраз сэрца, сімволіка прыроды, жанравая разнастайнасць.

Для беларускай літаратуры вельмі важнай з’яўляецца патрыятычная лірыка. Для народа важна захоўваць нацыянальную самасвядомасць і працаваць на карысць грамадства. Зоська Верас была менавіта такой: яна вяла актыўную грамадскую дзейнасць, няспынна пісала вершы, успаміны, знаёмілася і падтрымлівала стасункі з рознымі прадстаўнікамі беларускай інтэлегенцыі, а галоўнае – распаўсюджвала беларускую культуру, яшчэ з часоў гімназіі. Нават статус “дваранкі”, які тады абумоўліваў польскамоўнасць, не спыніў паэтэсу ад актыўнага ўжывання роднай мовы, вывучэння беларускай культуры і працы на карысць Радзімы.

Для асобы Зоські Верас характэрна гэтая беларуская любоў да прыроды, роднай зямлі, слова. Відавочна паўплываў на яе беларускамоўны дзядуля, які не цураўся размаўляць з сялянамі на беларускай мове. А бацька натхніў яе на вандроўкі па родных мясцінах.

Не апошнюю ролю ў вершах Зоські Верас іграе вобраз роднай песні. Уплыў актыўнай грамадскай дзейнасці і вывучэнне беларускай творчасці відавочны: “Хорам годным, тонам жывым // Песня родная плыві! // Паддай сілы тым, што ўсталі // Душы спячых прабудзі” [5, с. 40].

У беларускай паэзіі “песня”, як правіла, ёсць беларуская мова, а “песняры” – творцы слова, паэты, літаратары. Беларуская літаратура ведае вершы, прысвечаныя песнярам: “Песняру-беларусу” Янкі Купалы (“За родну песню будзь ваякай, // Не жджы заплаты ад людзей. // Пясняр – слуга слугі усякай, // Пясняр і цар усіх царэй!” [6]), “Песняру” Максіма Багдановіча (“Ведай, брат малады, што ў грудзях у людзей // Сэрцы цвёрдыя, быццам з камення. // Разаб’ецца аб іх слабы верш заўсягды, // Не збудзіўшы святога сумлення” [1]) і інш. Прысвечаны яны майстру слова, паэту, пісьменніку – “песняру”. Сутнасць вершаў у закліку да распаўсюджвання беларусамі і беларускімі пісьменнікамі беларускага слова, барацьбы за родную мовы і шчырай, сумленнай творчай працы. У творчасці Зоські Верас такіх вершаў-заклікаў не знайшлося.

Для паэтэсы важна існаванне ў яе жыцці і ў жыцці народа беларускага слова: яно дае сілы, матывуе, з’яўляецца крыніцай моцнай свядомасці, з’яўляецца адначасова і прычынай, і мэтай дзейнасці ўсёй беларускай інтэлегенцыі: “Гэй ляці ты наша песня // як шырокі край! // Сілай сваіх дзіўных чараў // на сэрцах іграй” [5, с. 40], “Люблю жалейкі песні сумны // Як па начной расе пальюцца” [5, с. 11].

Але родная песня для паэтэсы гэта не толькі ўвасабленне беларускага слова, але і неад’емная частка душы: “Вясну шжэ чуе мая душа раздольная // І песню

надзеі ціхенька пяе" [3], слова прыроды "То зноў высокі цёмны лес сасновы // пакрые бераг круты // Яго песняю… сумам, сумам ціхім вячыстым, // чалавеча, не нацешысься ты…" [5].

Тым часам Янка Купала пісаў: "Я відзеў душы сільныя, // Якім віхры ўсміхаліся // І пелі песні дзіўныя, // Каб выйшлі і змагаліся" [6]. І ў Зоські Верас, і ў Янкі Купалы, як мы можам заўважыць, душа – месца, дзе нараджаецца беларуская песня, льецца і нясецца ў далечыню з мэтай заклiку ці ж без мэты. Але падобны спосаб выкарыстання вобразу гаворыць пра культурны код, пра тое, што для Зоські Верас важна і дорага беларускае слова настолькі ж моцна, наколькі і для іншых беларускіх паэтаў, дзеячаў беларускай культуры.

Вядома, родная зямля выклікае не толькі пазітыўныя ўспаміны: Беларусі прыйшлося прайсці праз страшэнныя выбраванні гісторыі, якія пакінулі пасля сябе крывавы след. І гаворка ідзе не толькі пра Першую сусветную вайну. Зоська Верас у сваіх творах часта выказвае сваю любоў і боль да родных мясцін, роднай краіны і яе трагічнага лёсу: "Толькі мне цябе жаль, // Край родны! // Ты няшчасны, Ты галодны… // дзе, што ступіш, адно гора… // дзе слёз горкіх цэла мора… // Толькі мне ця жаль…" [5].

Доўгія ад'езды ад роднай старонкі таксама негатыўна ўплывалі на эмацыйны стан паэтэсы, лірычная гераіня сумуе аб сваёй радзіме, жадае вярнуць гэты грунтоўны, значны кавалак сваёй душы да сяб: "Дзе ж гэта хата, пакрытая мохам, // Што мяне гадавала? // Дзе ж гэта яблынька з лістом зялёным, // Што ў садзе стаяла?", "Хацела да Цебе напісаці // на лісточку кветкі пахучай, // але ж лісточак мог згінуць // ў пору буры грымучай…" [5].

Зоська Верас любіць свой родны дом. Вельмі перажывала яна продаж фальварку "Альхоўнікі". Пра згарэўшую "Лясную хацінку" ёй так і не сказалі, відаць, ведалі, наколькі моцна яна будзе хваляваццa. Для Зоські Верас мае значэнне не толькі яе краіна, але і малая радзіма, родны дом: "На ад'ездзінах з роднай я хаты, // пазагнаўшы загон шэры свой // ўзяў ў дарогу скарб вельмі багаты, // скарб, пасвенчаны Маткай-Зямлёй" [3]. Павагу і любоў да родных мясцін Зоська Верас змагла адзначыць простым прыёмам – напісала "Маткай-Зямлёй" з вялікай літары. Можна сказаць, што тут прысутнічаюць пэўныя хрысціянскія матывы, бо для лірычнай гераіні родная Зямля – гэта святое.

Агулам любоў да краіны ў ёй спарадзіла менавіта гэтая любоў да маленькіх рэчаў, розных частак яе Бацькаўшчыны: "Люблю я ў небе месяц, зоркі. // Што люблю больш! Недалічыш, // Бо я люблю усю зямельку // І весь край мой родны // Беларусь!..." [5].

Паэтэса працавітая, актыўная, што бачна з яе біяграфіі і вялікага ўкладу ў грамадства. У яе да самых апошніх дзён былі сілы на новую дзейнасць, вучобу, кантакты з людзьмі. І ўсё гэта не дзеля сябе, а для служэння Радзіме: "З сілай, энергіяй, што будзіць ў душах // яснае, магутнае сонца, // выйдзьмо з плугамі мы на папары, // у роднай нашай старонцы…" [5]. Зоська Верас не толькі сама заматываваная на працу, але і матывуе іншых. Само неба натхняе яе працаваць на зямлі і дзеля зямлі.

Адметная ў паэзіі З. Верас і інтымная лірыка. Шчасце кахання Зоська Верас спазнала двойчы. Значыць, столькі ж разоў яна спазнала і боль страты.

З Фабіянам Шантырам Зоська Верас пазнаёмілася падчас Першай сусветнай вайны ў 1915 годзе. Ён быў на 5 гадоў старэйшы за яе і жыў у Бабруйску. Тым не менш, гэта не перашкодзіла ім распачаць рамантычныя адносіны. Як і Зоська

Верас, Фабіян актыўна займаўся грамадскім жыццём, а таму часта наведваўся ў Мінск, дзе яе сустракаў. Зоська Верас таксама наведвала яго ў Бабруйску. Яна не пакінула яго нават пасля таго, як яго арыштавалі ў 1918 годзе. У 1919 годзе ў іх нарадзіўся сын, але гэта не стала шчаслівай канцоўкай для каханых. У 1920 годзе Шантыра расстралялі. У маладых аднялі ўсе магчымасці быць разам, а ў сына аднялі магчымасць пабачыць бацьку.

Пазней Зоська Верас сустрэла іншага мужчыну – Антона Войціка. Разам яны пабудавалі прасторную хатку пад Вільняй, а ў 1926 годзе яны павянчаліся ў Віленскім касцёле Святога Мікалая. Такім чынам, Людвіка стала Людвікай Антонаўнай Сівіцкай-Войцік. А 1 ліпеня 1927 года ў іх нарадзілася дачка Галіна. Разам з Антонам Войцікам Зоська Верас актыўна займалася выдавецкай справай, уплывала на развіццё беларускай культуры. Тым не менш, гэты шлюб скончыўся раней, чым хацелася б: у 1948 годзе Антон Войцік раптоўна памёр. На фоне падзей Другой сусветнай вайны і знікнення сына Антона Зоська Верас доўгі час займалася выключна гаспадаркай, яе грамадская і культурная дзейнасць прыпынілася, а душэўны і эмацыйны стан, вядома, пагоршыўся.

У сваёй інтымнай лірыцы Зоська Верас ні раз звяртаецца да вобразу сэрца. Менавіта адтуль ідуць усе пачуцці, у тым ліку і пачуццё кахання. Пачуццё, якое складана кантраляваць (“Не бійся так моцна // У смучонай грудзі, // Не зрывай апошні сілы // Ён тваім не будзе…” [5], “Ты не вер! Хоць казалі б вачэй тваіх, // хоць бы з енкам балесным гаварыла сэрца…” [3]), і якое так хочацца для сябе (“Аднаго сэрца мне трэба на свеце! // Аднаго сэрца так мала, так мала… // сэрца, каторае б мяне пакахала, // і я шчаслівай была бы, як дзеці…” [3], “Сціхні, сэрца, сціхні… // хай ня чуюць людзі, // як ты тужыш-б’ешся, // разрываеш грудзі…” [3]).

Ужо вядома даўно, што сэрца – гэта душа. Менавіта там баліць, калі чалавек перажывае моцныя пачуцці: шчасце, гнеў, нуда, каханне… Лірычная гераіня Зоські Верас часта звяртаецца да вобразу сэрца, бо менавіта там сканцэнтраваны ўсе яе самыя глыбокія перажыванні, якія яна пакідае ўнутры сябе, не выстаўляючы на паказ, як і Зоська Верас доўга хавала большасць сваіх вершаў у сваіх нататніках.

Але Зоська Верас бачыць каханне, як неспакой душэўны. Ёсць прыклады творчасці беларускіх паэтаў, для якіх, наадварот, каханне прыносіць спакой, напрыклад, у Янкі Купалы: “Пакахай жа мяне толькі // Усяей душой, // Не дай з жалю марнавацца, // Сэрца супакой!” [7]. З чым гэта звязана, можна толькі здагадвацца. Магчыма, Зоська Верас апісвала не столькі каханне, сколько закаханасць. Магчыма, гэта павязана з розным вопытам паэтаў. Тым не менш, гэта не робіць мастацкую вартасць кагосьці з паэтаў хоць колькі меншай.

Сэрца, вядома, адчувае не толькі каханне, але і любоў. І нават вядомы інтымны лірык Максім Багдановіч выкарыстоўвае вобраз сэрца ў сваіх творах для перадачы пачуцця і кахання, і любоў – да прыроды, да Радзімы, да зямл: “А як родную згадаю старану, // Як згадаю яе буднасць і нуду, – // Сэрца сціснецца, і я пяяць пачну, – // Мо душу хоць трохі гэтым адвяду..”, “Але мне сэрца пяе: не нудзіся! // Прыйдзе вясна!”, “Хай пяе ён у роднай зямлі, // Каб у сэрцах нам сорам збудзіць, // Каб змагацца з няпраўдай ішлі, // Ў чым сэрцы сумленне не спіць” [1].

Каханне для Зоські Верас – гэта не толькі шчасце і радасць. Часта гэта моцны боль: “Замкнецеся бедны вочы, // Забіты слязамі, // Годзі вам дарма глядзець // За яго слязамі… // Перастаньце, мае губы, // Белыя ад смутку, // Паўтараць яго імя //

Кожную мінутку" [5], "Аб гэта сэрца, што дзень прашу Бога, // прашу… і слязою плачу… // Але ж адно я толькі ясна бачу: // што я жадаю замнога… замнога…" [3].

Але нават так у душы лірычнай гераіне пануе надзея на шчаслівае каханне, на тое, што людзі памыляюцца і што аднойчы яна спазнае ўсю радасць гэтага пачуцця: "Хоць бы людзі казалі, ах не вер ты ніколі, // што каханне і шчасце – то пустыя гукі, // не вер, што жыццё наша і цёмна і сумна, // што душа чалавека не спазнае долі… // Ты не вер! хоць казалі б вачэй тваіх слёзы, // хоць бы з енкам балесным гаварыла сэрца… // хоць і вецер кусаў бы са стогнам і свістам… // хоць бы шэпатам–словам не сціхалі лозы… // Хоць душа бы ў магілу цярпення лягла // ты не вер хоць бы гэта – і праўда была…" [3].

Для яе сябра, Максіма Багдановіча, каханне – не настолькі балючае пачуццё, наадварот, лёгкае і шчаслівае: "Маладыя гады, // Маладыя жаданні! // Ні жуды, ні нуды, // Толькі шчасце кахання!" [1]. Балючым з'яўляюцца хіба што магчымыя наступствы: "Але расстацца нам час наступае; // Пэўна, ўжо доля такая у нас. // Моцна кахаў я цябе, дарагая, // Але расстацца нам час" [2]. Для Янкі Купалы ж увогуле каханне – пачуццё рэдкае: "Ці мела там сэрца, што шчырым каханнем // Магло адазвацца хоць раз прад скананнем? // Ой, мела напэўна, ой, моцна кахала! // Цяпер так сардэчна кахаюцца мала" [7]. Можна зразумець чаму, бо і ў нашыя, і ў даўнія часы каханне блыталі з закаханасцю, любоўю, прыхільнасцю ці нават пажадай. Але Зоська Верас піша менавіта пра шчырае пачуццё кахання, якое яна адчувала і вечна хацела адчуць, не гледзячы на боль і пакуты, якія ёй гэта прыносіла. Не само пачуццё, не, а абставіны і цяжкі лёс яе і яе каханых людзей.

Для Зоські Верас каханне – пяшчотнае пачуццё спакою на душы, яднанне з другім чалавекам, магчымасць быць перад ім любой: моцнай ці слабой, гучнай ці ціхай. Абы разам: "Пад вальца ледзь чутныя гукі // кружылі мы лёгка з табой… // п'яныя хорам музыкі, // зямлі не крануўшы стапой… // Ты горача сціснуў мне руку, // ў адказ табе сціснула я… // забыўшы жыццёвую муку, // была радаснай думка мая…" [3].

Пейзажная лірыка Зоські Верас з'явілася ў творчасці Зоські Верас не выпадкова. Мы ўжо адзначылі яе любоў да садаўніцтва і пчалярства. Сама Зоська Верас пісала: "Кожная раслінка, кожная зелейка раскажа не толькі дэталі свайго ўласнага жыцця, гісторыю свайго роду, але ж таксама напомніць аб той ролі, якую іграе ў жыцці нашых сялян, у іх медыцыне, чарах і варожбах. Часта адно характэрнае названне раскрые перад нашымі вачыма ўсю паэтычнасць і багатую фантазію нашага народа…" [3, с. 215].

Пейзажныя матывы часта сустракаюцца ў яе творах, як у патрыятычнай лірыцы, так і ў інтымнай. Часта яна звязвае свае пачуцці, думкі з прыродай, надвор'ем і жывёламі.

У яе вершах часта сустракаецца слова вецер, які, на нашу думку, у яе творах сімвалізуе свабоду, імкненне да волі душэўнай і не толькі: "У маёй песні вецер плача…" [3], "Пашла бы я на край света, // як той вецер, бура гэта, // што то гоніць чорны хмары // над даліны, над папары // ў цёмную даль…" [3].

Але вобраз ветру таксама можа выступаць антаганістам, выклікаць боль: "Ты не вер! хоць казалі б вачэй тваіх слёзы, // хоць бы з енкам балесным гаварыла сэрца… // хоць і вецер кусаў бы са стогнам і свістам…" [3].

У параўнанні з іншымі паэтамі, напрыклад, Багдановічам, для якога вецер асацыюецца са спакоем і цішынёй ("Цёплы вечар, ціхі вецер, свежы стог, // Улажылі

спаць мяне вы на зямлі” [2]), Зоська Верас апісвае вецер як жахлівую прыродную з’яву, якая не супакойвае, а, наадварот, асацыюецца з глыбокімі душэўнымі перажываннямі, пастаяннымі зменамі, якія могуць несці разбурэнні.

Душэўны стан лірычнай гераіні добра перадаецца праз жывёл, птушак: “Ой не кукуй, зязюлька, у гару. // Гэй, гэй, зязюлька ў гару. // Ой не кажы, што я шчасце маю. // Гэй, гэй, шчасце маю. // Маё шчасце раненька вясною. // Гэй, гэй, раненька вясною. // Паплыло з бурліваю вадою. // Гэй, гэй, з бурліваю вадою. // Гдзе ты, шчасце маё?” [4]. У дадзеным выпадку, на нашу думку, зязюля сімвалізуе час, хуткаплыннасць жыцця. Вясна сімвалізуе маладосць, якую змыла часам і вадою, у якой засталося яе шчасце і каханне.

У вершах Зоські Верас часта пераважаюць песімістычныя настроі, асабліва ў ранняй творчасці, падчас Першай сусветнай вайны. І няхай з гадамі яе верша сталі больш пазітыўнымі, адбітак ад гістарычных падзей і асабістых трагедый застаўся з ёй і ў яе вершах назаўсёды.

Першая сусветная вайна пакінула след у творчасці вялікай колькасьці паэтаў і пісьменнікаў (Цётка, Ядвігін Ш., Янка Купала, Якуб Колас і інш.). Але яе найбліжэйшым сябрам заставаўся Максім Багдановіч, які у сваёй паэзіі заставаўся пастаянным: у перыяд вайны ён напісаў цыкл вершаў “На ціхім Дунаі. Вершы беларускага складу” (1915–1916), паэму “Максім і Магдалена” (1915), прысвечаныя тэме кахання. Творы Максіма Багдановіча, не гледзячы на ўплыў вайны, захавалі ў сабе веру ў светлае, глыбокае пачуццё, не неслі з сабе негатыву. Магчыма, мы пабачылі б творы, прысвечаныя тэме вайны, калі б паэт пражыў крыху даўжэй.

Вада, рэкі, мора могуць несці розныя значэнні: як сімвал жыцця, руху, так і сімвал слёз, смутку: “Толькі мне цябе жаль, // Край родны! // Ты няшчасны… Ты галодны… // дзе, што ступіш, адно гора… // дзе слёз горкіх цэла мора… // Толькі мне ця жаль… // Пашла бы я ў край далёкі, // як ідуць быстры патокі, // як ідуць ясныя воды // да Дунаю, да свабоды, // да думяшчых хваль…” [4], “І ручаёчак я люблю // Што цячэ чысты па даліні // І казкі аб чужым краю // Шэпчэ чырвонай каліні” [3].

Восень, зіма, хмары – сімвал канца, жуды, нуды. Зоська Верас выкарыстоўвае дадзеныя сімвалы і вобразы для перадачы душэўнага неспакою і суму лірычнай гераіні: “Пашла бы я на край света, // як той вецер, бура гэта, // што то гоніць чорны хмары // над даліны, над папары // ў цёмную даль…” [3], “Забыць ня мае сілы. // І думка ў ім адна // Блізкай зімы магілы, // Вярнісь, вярнісь, вясна…” [4].

Але зіма і снег таксама могуць несці даволі прыемны настрой. Зіма – час спакою, калі прырода мірна спіць, адпачывае пад белай коўдрай снегу. А белы колер надае атмасферу чысціні, новага пачатку, чыстага ліста, з якога можна ўсё пачаць: “Так ясна… так ціха… так бела // І усюды вялікі спакой // Зямля быццам зусім абамлела, // Не цешыцца яснай зарой…” [3]. Насмрэч, гэты верш можна ўспрымаць і з другога боку – як сумны летаргічны сон: “Лес цёмны, сасновы, вялікі // Маўчаў зачарован стаіць… // Не чутны вясёлыя клікі // І пташак хор маўчыць…” [3].

Гэта падобна на верш Максіма Багдановіча “Зімой” (1910), дзе надвор’е таксама апісваецца спакойным, ціхім і мірным. Паэт нават рады надыходу зімы, радасна вітае: “Здароў, марозны, звонкі вечар! // Здароў, скрыпучы, мяккі снег! // Мяцель не вее, сціхнуў вецер, // І волен лёгкіх санак бег” [1].

Сонца ў Зоські Верас, наадварот, з’яўляецца сімвалам надзеі, цеплыні, дабрыні, цесна звязанае з вясной. Напрыклад, у вершы “Сонейка грэе” (“І прыйшоў вось

час жаданы: // Рады мы вясну сустрэць. // Просім сонца край каханы // Абудзіць і абагрэць" [1, с. 29]). Сонца – сімвал моцы. Яно дае жыццё прыродзе, дае любзям сілы працягваць: "З сілай, энергіяй, што будзіць ў душах // яснае, магутнае сонца" [4].

Зялёны колер таксама з'яўляецца сімвалам жыцця ў многіх паэтаў, і творчасць Зоські Верас не выключэнне: "Люблю я поле луг зялёны, // Дзе нашы конікі пасуцца" [3], "Дзе ж гэта хата, пакрытая мохам, // Што мяне гадавала? // Дзе ж гэта яблынька з лістом зялёным, // Што ў садзе стаяла?" [4].

Расліны здаўна з'ўляліся сімваламі жыцця і здароўя. Мала таго, расліны сталі сімваламі цэлых народаў і краін. Немагчыма, гаворачы пра Беларусь, не згадваць пра каласы, васількі, лён. Для Зоські Верас гэта таксама так: "Гэта памятка з роднай Зямелькі, // яе сьлёзнай расою абліта. // Гэта беленькі цвет канапелькі // і калосік даспелага жыта…" [3].

Любоў да роднай хаты праяўляецца не толькі ва ўспамінах пра сям'ю, але праз прыроду, якая акаляла малую Зоську Верас тады: "Гдзе ж гэта хата, пакрытая мохам, // Што мене гадавала? // Гдзе ж гэта яблынька з лістом зялёным, // Што ў садзе стаяла?" [4].

Як бы то ні было дзіўна, але ёсць пэўная частка прыроды, якая Зоську Верас не толькі засмучвае, але і пужае. Гэта сасновы лес на яе малой радзіме. Але нават пры ўсіх негатыўных пачуццях, якія перадае нам паэтэса праз сваю лірыку, яна ж потым зазначае, што любіць нават гэтую частку свайго дзяцінства: "Люблю я нават лес сасновы // Хоць у ім так страшна. Моцны Божа! // Які ж ён цёмны і вялікі // У ім чалавек зблудзіці можа!" [3], "То зноў высокі цёмны лес сасновы // пакрые бераг круты // Яго песняю… сумам, сумам ціхім вячыстым // чалавеча не нацешысься ты…" [3].

Нескладана здагадацца, якая ўлюбёная пара года ў Зоські Верас – вясна. Час квецені прыроды, цеплыні, зялёнага колеру. Час адлігі і вяртання да жыцця: "Забыць ня мае сілы. // І думка ў ім адна // Блізкай зімы магілы, // Вярнісь, вярнісь, вясна…" [4], "Маё шчасце раненька вясною. // Гэй, гэй, раненька вясною" [4].

Такое ж, па іроніі, і жыццё Зоські Верас – вясна і лета часоў актыўнай грамадскай дзейнасці змяніліся вайной, прынеслі восень у жыццё Зоські Верас. А потым і зіма – застой у яе творчай і грамадскай дзейнасці, жыццё ў якасці гаспадыні, маці і бабулі. Можна саказаць, Зоська Верас прадказала сваё жыццё: "Грамадою, чэрадою, // Плылі думкі за табою, // От ясны светлы май… // Паўставалі летуценні // Заціхалі боль, цярпення // Прад вачыма – рай… // Зашумелі, зашумелі нудна лозы… // Паліліся дажджу слёзы // Восень надыйшла. // Душа сціхла, страпянулася // Скінуў чары, аглянулася // Раю не знайшла!.." [3, с. 14]. Але і тое не надоўга – хутка зноў усё зменіцца квяцістай вясной.

Такім чынам, паэтычныя творы Зоські Верас  разнастайныя па жанры, гэта патрыятычная, інтымная і пейзажная лірыка. Паэтэса актыўна выкарыстоўвала лірычныя вобразы ў сваіх творах, рабіла іх цэнтрам увагі і перадавала праз іх асноўную інфармацыю пра пачуцці і настрой, які ў сабе нясе вершаваны твор. Выбар вобразаў і іх роля абумоўлены яе асабістымі перакананнямі і перавагамі і могуць адрозніваюцца ад таго, што мы ўжо бачылі ў творах іншых паэтаў.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Багдановіч, М. Выбраныя творы / М. Багдановіч. – Мінск : МФ «Беларускі кнігазбор», 1996. – 494 с.

2. Лазарук, М.А. Беларуская літаратура : вучэб. дапам. для 8-га кл. устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М.А.Лазарук, В.І.Русілка, І.М.Слесарава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011.00
3. Верас, З. Выбраныя творы / Зоська Верас. – Мінск : Бел. навука, 2015. – 572 с.
4. Верас, З. «Вялікі» нататнік / З. Верас // Літ. музей М. Багдановіча. – Асн. фонд. – КП 11235.
5. Верас, З. «Малы» нататнік / З. Верас // Літ. музей М. Багдановіча. – Асн. фонд. – КП 8144.
6. Янка Купала // Поўны збор твораў. У 9 т. – Т. 1. : Вершы, пераклады - Мінск : Маст. літ., 1995. – 462 с.
7. Янка Купала // Поўны збор твораў. У 9 т. – Т. 6. : Паэмы, пераклады. - Мінск : Маст. літ., 1999. – 430 с.

## TOPAS OF THE HOME IN THE POETRY OF ANTONINA KHATENKO

**M. A. Feshchanka**
*State Educational Institution "Novy Dvor School"*
*Minsk, Republic of Belarus, mracapra4@gmail.com*

The article examines the genre diversity of Zoska Veras' poetry: patriotic, intimate, and landscape lyrics. Special attention is paid to the figurative system of the poetess' poems, and also analyzes how personal life experience and social activity influenced her work, and assesses the significance of Zoska Veras' poems for Belarusian literature of the early 20th century.

*Keywords:* Zoska Veras, Belarusian poetry, lyrics, image of native song, image of heart, symbolism of nature, genre diversity.